В.А.ВАРОНІН

# УНУТРАНЫ ГАНДАЛЬ У ПОЛАЦКІМ ВАЯВОДСТВЕ ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XVI ст.

У айчыннай і замежнай гістарыяграфіі шмат увагі традыцыйна надаецца вывучэнню такога важнага сектара эканомікі, як гандаль. Гандлёвыя сувязі паміж кантынентамі, дзяржавамі, рознымі рэгіёнамі адной дзяржавы даследаваны дастаткова грунтоўна. Значна менш распрацаваны пытанні, якія датычацца гандлю ўнутранага, рэгіянальнага. У дачыненні ранняга перыяду гістарычнага развіцця такі стан даследаванняў тлумачыцца аб'ектыўнымі абставінамі: востры недахоп ці нават поўная адсутнасць пісьмовых крыніц. У гэтым сэнсе Падзвінне да XVI ст. нічым не адрозніваецца ад іншых рэгіёнаў Беларусі. Аднак з названага часу з'яўляюцца адрывачныя звесткі па праблеме, на падставе якіх можна вызначыць хаця б некаторыя рысы ўнутранага гандлю Полацкага ваяводства ў разглядаемы намі перыяд.

У першай палове XVI ст. у Полацкім ваяводстве разам са знешнім гандлем паспяхова развіваўся гандаль унутраны. Прычым дзяржава пільна сачыла за тым, каб нішто не перашкаджала гэтаму. У 1552 г. полацкі баярын Дзмітрый Корсак звярнуўся да вялікага князя літоўскага і караля польскага Жыгімонта II (Аўгуста) з просьбай дазволіць заснаваць у сваім маёнтку Плісе гандлёвыя службы з кірмашом і корчмамі. Вось як выкладае яго аргументацыю гаспадарскі прывілей: "тое место торгомъ и местом нашимъ на переказе не будеть, бо... от Полоцкого места нашого у десети милях тое именье его лежыть, а иные ... нигде близко места нашого нетъ". Манарх даў дазвол[1]. Такім чынам, радыус ваколіцы, якая карысталася паслугамі Полацка як цэнтра мясцовага гандлю, не перавышаў 10 старарускіх міль (прыблізна 75 км). Варта адзначыць, што не толькі полацкія мяшчане ездзілі гандляваць па сёлах і вёсках, але і сяляне ездзілі ў Полацк гандляваць. Пра гэта, а таксама пра асартымент тавараў унутранага рынку паведамляе наступны выпадак. Да полацкага ваяводы 4 лютага 1539 г. са скаргай на Мікалая Глябовіча звярнуўся Міхал Сапега. Ён абвінаваціў Глябовіча ў тым, што той збіў і абрабаваў больш за 20 сялян Сапегі і яго мачахі. У іх былі забраны жыта, пшаніца, а таксама грошы і іншыя рэчы. Сяляне купілі збожжа ў Полацку[2]. Тут відавочная сувязь паміж гандлем хлебам знешнім і ўнутраным. Сяляне не толькі пастаўлялі збожжа на рынак, але пры пэўных акалічнасцях і куплялі яго там. Звяртае на сябе ўвагу тое, што падзея адбылася ў студзені ці ў першыя дні лютага, што можа сведчыць пра продаж сялянамі збожжа ў сезон і куплю ўзімку, але наколькі рэгулярнай была такая практыка – цяжка сказаць.

Некаторыя віды дзейнасці сельскіх жыхароў прама сведчаць пра іх цесную сувязь са знешнім рынкам. Напрыклад, у 1558 г. полацкі крамнік Іван Палуян сцвярджаў на гаспадарскім судзе, што ён купляў попел у сялян[3]. Зразумела, што для ўнутранага полацкага гандлю попел не меў значэння, аднак ён, як і іншыя прадукты перапрацоўкі леса, быў адным з галоўных (разам са збожжам) экспартных тавараў Полаччыны першай паловы XVI ст. Але сяляне ўдзельнічалі ў знешнім гандлі не толькі праз мяшчан, існуюць весткі, што яны гандлявалі на знешнім рынку і самі. Так, у 1561 г. полацкі мытнік Фелікс абвінаваціў перад Жыгімонтам II віцебскага войта і полацкіх бурмістраў у тым, што яны выдаюць квіты на гандаль у Рызе не толькі мяшчанам, але і (незаконна) сельскім жыхарам[4].

Натуральна, полацкія мяшчане праяўлялі значна большую ў параўнанні з сялянамі гандлёвую актыўнасць, таму што для іх гандаль быў адным з асноўных відаў дзейнасці. Удзел полацкіх мяшчан у знешнегандлёвых

зносінах добра вядомы. Для многіх з іх ён пачынаўся са скупкі тавараў у сельскіх жыхароў. Унутраны гандаль меў вельмі важнае значэнне і для забеспячэння разнастайных, і ў першую чаргу харчовых, патрэб такога ёмістага рынку, як Полацк. Звестка пра тое, што полацкія мяснікі здаўна скупляюць жывёлу па сёлах, а таксама ў самім Полацку, датуецца 1557 г.[5] На гаспадарскім судзе 1558 г. высветлілася, што полацкія мяшчане ездзяць гандляваць і "под рубеж... по селом"[6].

У рэканструкцыі становішча ўнутранага полацкага гандлю вялікую дапамогу могуць аказаць матэрыялы па такім і геаграфічна, і эканамічна блізкім Полаччыне рэгіёне, як Віцебшчына. Малаверагодна, каб унутраны гандаль на Полаччыне і на Віцебшчыне нечым прынцыпова адрозніваліся паміж сабой. Так, у 1540 г. віцебскія, як і полацкія, мяшчане куплялі па валасцях жывёлу, а таксама футры (рысяў, куніц, баброў ды іншых звяроў) і мёд[7]. Захаваліся і некаторыя звесткі пра формы гандлёвай кааперацыі на Віцебшчыне. У сярэдзіне 30-х гг. XVI ст. мяшчане Алтушка Чарнічын і Іван Хімінок разам з глазаміцкім старцам Амяльянам "змовили... посполу вси три у товарыстве торговати": яны склалі свае грошы і "за границу ходили и по селомъ мед... куповали". За мёд расплачваліся грашыма[8].

Такім чынам, полацкія мяшчане скуплялі ў сялян жывёлу, футры, мёд і, вельмі верагодна, прадукты раслінаводства. Усё гэта, а таксама матэрыялы полацкай рэвізіі 1552 г., згодна якім сяляне выплачвалі такія шырока распаўсюджаныя падаткі, як баброўшчына і "куніца", грашыма, сведчаць, што расплачвацца з сялянамі за купленыя тавары грашыма было для мяшчан звычайнай з'явай. Аднак гандаль, як здаецца, мог ісці толькі з частковым выкарыстаннем грошай: мяшчане ў абмен на мёд, футры і інш. маглі прывозіць на вёску, напрыклад, рамесныя вырабы. Такія з іх, як сякеры, косы, павінны былі карыстацца попытам. Пераканаўчы адказ на дадзенае пытанне магла б даць археалогія, але сельскія паселішчы вывучаны ёй, на жаль, вельмі слаба.

Яскравым сведчаннем развіцця ўнутранага рынку і фарміравання новых цэнтраў лакальнага гандлю, а значыць, паглыблення таварна-грашовых адносін у сельскай мясцовасці, з'яўляецца рэзкае павелічэнне колькасці мястэчак на Полаччыне ў першай палове XVI ст. Відавочна, яшчэ ў ранейшы час стаў цэнтрам рэгіянальнага гандлю Лукомль. У 50-я гг. XVI ст. на тамтэйшым кірмашы была "много людей объчихъ [г.зн. чужых, прыезджых – В.В.], а звлаща купецькихъ людеи"[9]. Значных памераў к сярэдзіне названага стагоддзя дасягнула Друя. Полацкая рэвізія 1552 г. зафіксавала тут 102 "дыма" мяшчан[10]. У 1516 г. вялікі князь і кароль Жыгімонт І дазволіў Івану Сапегу заснаваць крэпасць і мястэчка Вяту[11], у 1526 г. ён жа даў дазвол славутаму князю Канстанціну Астрожскаму на заснаванне крэпасці і мястэчка Нізгалава[12], у 1530 г. – полацкаму ваяводзе Пятру Кішцу – на "асаджэнне" мястэчка ў Асвеі[13]. У 1541 г. ён пацвердзіў ранейшы дазвол Івану Корсаку на заснаванне мястэчка Залесся[14], а ў 1551 яго сын Жыгімонт II – Астафію Корсаку на заснаванне Забор'я[15]. У 1552 г. Жыгімонт II дазваляе Глебу Корсаку "места садзіць" у Галубічах[16] і, як ўжо згадвалася, Дзмітрыю Корсаку ў Плісе. Апрача таго, у актах полацкага ваяводскага суда за 1533 г. згаданы мяшчане глыбоцкі і чашніцкі[17], а ў рэвізіі 1552 г. – мястэчкі Беразвеч і Селішча[18]. Пры гэтым варта адзначыць, што прыведзены пералік полацкіх мястэчак далёка не поўны: крыніцы данеслі да нас толькі адрывачныя звесткі. Гаспадарскі прывілей на заснаванне мястэчак утрымліваў палажэнні, якімі іх уладальнікам дазвалялася па пэўных днях (звычайна раз на тыдзень) ладзіць кірмашы, а таксама трымаць корчмы. Паміж 1543 і 1546 гг. полацкі ваявода Станіслаў Давойна заснаваў крэпасць Дрысу (на месцы сучаснага Верхнядзвінска).

Горад хутка рос і развіваўся і к пачатку 60-х гг. XVI ст. стаў буйным гандлёвым цэнтрам Полацкага ваяводства[19].

Пра высокі ўзровень і значную інтэнсіўнасць унутранага гандлю сведчаць, між іншым, развітая сетка дарог мясцовага значэння, як і шырокае выкарыстанне ў якасці мясцовых шляхоў зносін прытокаў Дзвіны: рэк Вулы, Дзісны, Сар'і, Дрысы, Обалі. На некаторых з іх дзейнічалі мытні.

У першай палове XVI ст., як і ў ранейшы перыяд, Полацк быў важным цэнтрам транзітнага гандлю ў маштабах усяго Усходнееўрапейскага рэгіёну. Цесную сувязь са знешнім меў унутраны полацкі гандаль, які, дзякуючы гэтай сувязі, дасягнуў у азначаны перыяд досыць развітых для свайго часу формаў. Найбольш актыўна ўдзельнічала ва ўнутраным гандлі полацкае мяшчанства. Яно выконвала і ролю пасрэдніка паміж унутраным і знешнім рынкамі. Праз названае пасрэдніцтва, а ў некаторых выпадках, магчыма, і напрасткі са знешнім рынкам аказвалася звязаным і сельскае насельніцтва Полаччыны, якое такім чынам хутка ўцягвалася ў таварна-грашовыя адносіны.

[1] Гл.: Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. КМФ-18, воп.1, адз.зах.35, арк.116–116 адв.

[2] Беларускі архіў (далей – БА). Мн., 1928. Т.2. С.281–282.

[3] НГАБ. Ф. КМФ-18, воп.1, адз.зах.249, арк.133 адв.

[4] Там жа. Адз.зах.254, арк.238 адв.–239.

[5] Там жа. Адз.зах.251, арк.62, 63 адв.

[6] Там жа. Адз.зах.249, арк.129 адв.–130.

[7] Там жа. Адз.зах.35, арк.79.

[8] Там жа. Адз.зах.228, арк.35–35 адв.

[9] Там жа. Адз.зах.247, арк.802.

[10] Полоцкая ревизия 1552 года. М., 1905 (далей – ПР 1552 г.). С.105,107.

[11] НГАБ. Ф.КМФ-18, воп.1, адз.зах.9, арк.261 адв.

[12] Там жа. Адз.зах.12, арк.440–441; Archiwum ksiazat Sanguszkow w Slawucie. Lwow, 1890. T.3. S.297–299.

[13] НГАБ. Ф.КМФ-18, воп.1, адз.зах.17, арк.113 адв.–134.

[14] Там жа. Адз.зах.24, арк.138–138 адв.

[15] Там жа. Адз.зах.28, арк.108 адв.–109.

[16] Там жа. Арк.118 адв.–119.

[17] БА. Т.2. С.189–190.

[18] ПР 1552 г. С.73, 117.

[19] Гл.: НГАБ. Ф.КМФ-18, воп.1, адз.зах.39, арк.520–521.